ўмовы будуць спрыяць далейшаму развіццю беларускай тэалінгвістыкі, то можна з упэўненасцю сцвярджаць, што і беларуская рэлігійная мова зможа заняць годнае месца ў шэрагу такіх славянскіх рэлігійных моў, як руская, сербская, польская і ўкраінская.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Гадомский А. К. Изучение религиозной лексики в украинской теолингвистике XX–XXI вв. // Теолингвистичка проучавања словенских језика. Београд : Српска академија наука и уметности. 2013. С. 45–70.
2. Гадомский А. К. Русская теолингвистика : история, основные направления исследований // Стил. Београд. 2010. № 9. С. 357–373.
3. Гадомский А. К. Стилистичєский подход к изучению религиозного языка // Стил. Београд. 2008. № 7. С. 21–36.
4. Гардун А. С. Праблемы фарміравання беларускай багаслоўскай тэрміналогіі // Беларуская мова ў сакральнай сферы : гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 21 лют. 2018 г. / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; рэдкал. : С. Л. Гаранин (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : Беларуская навука, 2019. С. 7–12.
5. Постовалова В И. Теолингвистика в современном гуманитарном познании : истоки, основные идеи и направления // Magister Dixit. 2012. № 4. С. 54–101.
6. Чарота І. А. Дыскусійныя моманты праблемы «беларуская мова і Царква» // Беларуская мова ў сакральнай сферы : гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 21 лют. 2018 г. / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; рэдкал. : С. Л. Гаранин (адк. рэд.), І. У. Будзько, Т. В. Пятрова. Мінск : Беларуская навука, 2019. С. 12–21.
7. Gadomski A. Основные направления теолингвистических исследований в современном языкознании // Prace naukowe Akademii im. Yana Długosza w Gzęstohowie. 2015. z. XI. S. 45–62.
8. Gadomski A. Teolingwistyka polska w kontekście teolingwistyki słowiańskiej // Prace naukowe Akademii im. Yana Długosza w Gzęstohowie. 2015. z. X. S. 7–24.
9. Dalewska-Greń H. Yęzyki słowiańskie. Warszawa : Wydawnictwo naukowe PWN. 2012. 637 s.
10. Zdunkiewicz D. Wykłady ze stylistyki. Warszawa : Wydawnictwo naukowe PWN. 2013. 213 s.


**Яфімаў А. В. (Мінск)**

## Барацьба з ідэалізмам і літаратуразнаўства: асобныя рэлікты ў сучаснай навуцы

Не заўсёды патлумачыць асаблівасці развіцця пэўнай навукі магчыма толькі яе ўнутранымі фактарамі. Так, ёсць пытанне, чаму беларускім літаратуразнаўствам амаль не вывучалася адлюстраванне ўяўленняў пра лёс у помніках прыгожага пісьменства. І само літаратуразнаўства даць адказ не можа.

Уяўленні пра лёс – універсальны элемент чалавечай культуры. Канкрэтныя ўвасабленні гэтых уяўленняў тояць у сабе нямала звестак

пра светапогляд і ўзровень асветы іх носьбітаў, а таксама пра ўплывы і рэцэпцыю пэўных міфалагічных, рэлігійных і філасофскіх парадыгм. Азначаныя семантычныя элементы знайшлі адлюстраванне, сярод іншага, у шматлікіх помніках літаратуры, адкуль іх можна вылучыць і «дэшыфраваць», тым самым зрабіўшы ўнёсак у даследаванне твора, які іх утрымлівае. Аднак адпаведныя даследаванні практычна не праводзіліся.

На першы погляд можа падацца, быццам адлюстраванне ўяўленняў пра лёс у літаратуры не вывучалася айчыннымі спецыялістамі проста таму, што ў гэтым няма патрэбы. Аднак рэтраспектыўны аналіз навуковай цікавасці да азначанай тэмы дае зразумець, што адпаведныя даследаванні праводзіліся з даўніх часоў у розных краінах, у тым ліку ў Вялікім Княстве Літоўскім. Напрыклад, Мацей Казімір Сарбеўскі, добра ведаючы антычную літаратуру, міфалогію і паэтыку, рабіў спробы тлумачыць вобразы і сімвалы ў мастацкіх творах і, такім чынам, яшчэ ў першай палове XVII ст. ушчыльную падышоў да навуковага аналізу сімвалаў фатуму ў помніках літаратуры [6, с. 101–103; 9, с. 131, 133–134, 139].

Праблемы лёсу вывучаліся і ў Расійскай імперыі, аднак адпаведныя даследаванні згаслі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пры гэтым у сучаснай Расіі зноў назіраецца цікавасць да разглядаемай тэмы. Такім чынам, карані сённяшняй нераспрацаванасці праблемы адлюстравання ўяўленняў пра лёс у літаратуры варта шукаць у асаблівасцях савецкай навукі.

Справа ў тым, што такія паняцці, як «лёс» (і рус. «рок»), «правідэнцыялізм», «фаталізм» і да т. п. самі па сабе ідэалістычныя, а пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі (а потым у СССР) на дзяржаўным узроўні разгарнулася барацьба з ідэалізмам («ідэалізм» – тэрмін для пазначэння шырокага спектру філасофскіх канцэпцый і светапоглядаў, у аснове якіх ляжыць сцвярджэнне аб першаснасці ідэі ў адносінах да матэрыі).

Карані гэтай барацьбы можна знайсці ў працах К. Маркса («Да крытыкі гегелеўскай філасофіі права») і Ф. Энгельса («Анты-Дзюрынг»), аднак, напэўна, найбольшы ўплыў зрабіла кніга У. Леніна «Материализм и эмпириокритицизм. Критические заметки об одной реакционной философии» (1909), у якой аўтар жорстка крытыкаваў прыхільнікаў ідэалізму і адпаведны напрамак філасофіі ўвогуле [11]. Далейшае развіццё падзей і дагматызацыя ленінскіх прац прывялі да трансфармацыі і спрашчэння асобных аўтарскіх канцэпцый. Заклік да барацьбы з ідэалізмам выпаў з кантэксту, ідэалізм безапеляцыйна пачаў трактавацца як «антынавуковы напрамак філасофіі»,

а словазлучэнне «ідэалістычная філасофія» даволі хутка зрабілася пеяратывам.

Так, 1 снежня 1920 г. у газеце «Правда» быў надрукаваны ліст ЦК РКП «О пролеткультах», у якім «социально чужими» элементамі называліся «сторонники враждебной марксизму идеалистической философии»[1] [13, с. 146]. Заслугоўвае ўвагі і наступная цытата: «…антимарксистские взгляды… занимали умы… интеллигенции, упивавшейся в годину реакции богостроительством и различными видами идеалистической философии…» [13, с. 147].

А вось што паведамлялася ў праграмным артыкуле часопіса «Под знаменем марксизма», які пачаў выходзіць з 1922 г.: «Мы не стремимся быть исследователями… мы борцы, наш журнал – журнал борьбы за материалистическое мировоззрение…» [14, с. 3].

Пасля артыкула ад рэдакцыі друкаваўся ліст Л. Троцкага, таксама з праграмнымі тэзісамі і ўстаноўкамі: «…В такого рода переломную эпоху, как наша… весьма вероятны попытки различных идеалистических и полу-идеалистических философских школ и сект овладеть сознанием рабочей молодежи» [15, с. 6].

Далей Троцкі вітаў тых, «…кто не признает существования небесных мистических сил, способных по произволу вторгаться в личную или общественную жизнь и направлять ее в ту или другую сторону…» [15, с. 7], даючы зразумець, што менавіта такім людзям будзе працей рэалізаваць свой патэнцыял у новых умовах.

У 1924 г. выкладчык БДУ Саламон Кацэнбоген у артыкуле «Нарысы па гісторыі першабытнай культуры Беларусі» пісаў: «Умацаванне матэрыялістычнай філасофіі крок за крокам прыводзіць да адваявання ўсё новых пазіцыяў у тых навуках, якія да нядаўняй прошласці здаваліся няпрыступнай цытадэллю ідэалістычнай думкі. <…> Ідэалізм – законнае дзіця рэлігіі. Не дзіўна, што французскія матэрыялісты XVIII веку лічылі першым сваім доўгам “гільятынаваць бога”, зруйнаваць да асновы падставы тэалагічнага мышлення» [8].

Сітуацыя пагоршылася пасля «вялікага пералому». Як піша В. Бажанаў, «зацвярджэнне аўтарытэта аднаго “правадыра” ў палітыцы і ва ўсіх галінах навукі… дагматызацыя марксісцкай ідэалогіі, якой надаваўся статус адзінага навуковага светапогляду… прывялі ў 1930–40-х гг. да ўзнікнення ідэалагізаванай навукі, якая ахапіла… ці не ўсе галіны навуковых ведаў» [2, с. 33]. А сама навука «была мабілізавана на “службу сацыялістычнаму будаўніцтву”…» [10, с. 116].

[1] Тут і далей вытрымкі з перыядычнага друку 20-х гг. XX ст., а таксама выказванні палітычных, грамадскіх і культурных дзеячаў той эпохі прыводзяцца на мове арыгінала для іх больш адэкватнага разумення.

Так, у студзені 1931 г. кіраўнік Галоўліта П. І. Лебедзеў-Палянскі на сакрэтнай нарадзе для загадчыкаў рэспубліканскіх Галоўлітаў і Аблкрайлітаў казаў: «…Центр (дзейнасці Галоўліта. – *А. Я.*) будет сейчас переноситься на строгое выполнение генеральной линии Партии... <…> …Генеральную линию партии мы должны рассматривать не только в области чистой политики… мы должны… линию партии распространить… и на социологию, и на историю, и на философию, и на медицину, и на сельское хозяйство, и на художественную литературу. <…> …литературу мы изучаем не ради литературы, но смотрим на нее, как на определенное идеологическое средство воспитания масс в целях осуществления развернутого наступления социализма по всему фронту» [12, с. 190–193].

Як нельга лепш адлюстроўвае тагачасную сітуацыю ў навуцы цытата з першага нумару часопіса «Савецкая краіна» (орган Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Беларускай акадэміі навук) за 1931 год: «Яшчэ многа можна спаткаць такіх людзей, якія ўяўляюць сабе навуку бяскласавай, аполітычнай, бесстароньняй. Гэткія ўяўленьні аб навуцы зусім няправільныя» [1, с. 42].

Наступная цытата: «Уся шкоднасьць, уся варожасьць беларускага контр-рэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму ў краязнаўстве заключаецца іменна ў тым, што ён усімі спосабамі імкнуўся… адцягнуць увагу шырокіх мас ад удзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, зацямніць іх галовы мінуўшчынай, старасьветчынай, царкоўшчынай, і гэтым шляхам… імкнуўся знішчыць краіну дыктатуры пролетарыяту…» [16, с. 13]. Праз некалькі старонак аўтар падагульняе свае высновы саркастычным абурэннем: «Займайся чым хочаш, толькі не разьвіцьцём вытворчых сіл у соцыялістычным напрамку, займайся чартаўшчынай, усякімі замовамі, але ня справай пабудовы соцыялізму ў Савецкім Саюзе» [16, с. 22]. Нагадаем, гэта цытата з артыкула ў краязнаўчым часопісе.

Падагульнім асаблівасці сітуацыі 1920–30-х гг.: ідэалізм, тэізм, містыцызм, зварот да мінулага і фальклору расцэньваліся яе штосьці непатрэбнае, збыткоўнае і нават шкоднае. Нядзіўна, што ў такіх умовах было няшмат ахвотных займацца вывучэннем адлюстраванняў уяўленняў пра лёс (якія атаясамліваліся з ідэалізмам і рэлігіяй) у помніках прыгожага пісьменства, тым больш што адпаведныя элементы найлепш выражаны ў першую чаргу ў старажытнай літаратуры або ў фальклоры. З іншага боку, зразумела, што вывучэнне прадмета не з'яўляецца прапагандай гэтага прадмета і нават сведчаннем сімпатыі да яго з боку даследчыка. Так, у кнізе з нейтральнай назвай «Сучасная рэлігійнасьць» (1930) С. Я. Вальфсон эмацыйна заклікаў

ваяваць за атэізм, называючы рэлігію «ворагам», даследаваць якога неабходна менавіта для таго, каб з ім змагацца: «Барацьба з рэлігіяй патрабуе вывучэньня рэлігіі. Каб перамагчы ворага, трэба ведаць яго» [3, с. 7–8]. Падаецца, што такі падыход мог быць выкарыстаны як пэўны пралаз для даследавання ўсяго, з чым змагалася тагачасная ідэалогія. Аднак пры гэтым варта ўзгадаць акалічнасць, пра якую пісалася вышэй: навука павінна была мець прыкладны характар і падпарадкоўвацца задачам «сацыялістычнага будаўніцтва». Складана ўявіць, якім чынам мажліва было прыладзіць да задач сацыялістычнага будаўніцтва даследаванні ўяўленняў пра лёс у літаратуры і якую практычную карысць маглі б прынесці такія даследаванні тагачаснай уладзе. Такім чынам, працаваць у азначаным напрамку ў тыя часы было калі яшчэ не рызыкоўна, дык прынамсі бессэнсоўна.

Прасачыць адпаведныя з’явы на матэрыялах уласна літаратуразнаўства складаней, бо першы бібліяграфічны зборнік адпаведнай накіраванасці быў выдадзены толькі ў 1964 г. і ахоплівае матэрыялы з 1945 г. [5, с. 20]. Тым не менш нават сама гэтая кніга пачынаецца са сказа: «Савецкае літаратуразнаўства і крытыка служаць камуністычнаму выхаванню народа» [5, с. 5].

У пасляваенны перыяд беларускае літаратуразнаўства вызначылася ў першую чаргу працамі, прысвечанымі жыццю і творчасці асобных пісьменнікаў, пераважна XX ст. Аднак наступным этапам яго развіцця стаў пераход да абагульняючых і аналітычных прац, у якіх даследчыкі імкнуліся «намаляваць карціну развіцця беларускай літаратуры і раскрыць заканамернасці літаратурных з’яў, выявіць традыцыі класічнай спадчыны і новыя якасці савецкай літаратуры» [5, с. 13]. Пры гэтым распрацоўка тэарэтычных пытанняў у дадзенай сферы была накіравана ў першую чаргу на даследаванне сацыялістычнага рэалізму. Увогуле ж, прынамсі да часоў перабудовы беларускае літаратуразнаўства, як і савецкая навука ў цэлым, было абмежавана ідэалогіяй. Адносна наступных часоў можна казаць пра рэліктавае ўздзеянне старых падыходаў, якія мелі моцную інерцыю і праяўляліся не столькі знешне, колькі ўнутрана. А. А. Гужалоўскі піша: «…найвялікшую шкоду палітычная цэнзура нанесла грамадскай свядомасці, сфарміраваўшы ў жыхароў БССР цэнзурную ментальнасць (самацэнзуру), якая выключала з поля зроку цэлыя пласты нацыянальнай і сусветнай гісторыі і культуры» [7, с. 7].

Трэба адзначыць, што вышэйпрыведзеная цытата ў пэўнай ступені захоўвае актуальнасць і сёння. Так, ужо ў пачатку XXI ст. іншы беларускі даследчык пісаў: «Недаацэнка ролі сімвалізму ў беларускай літаратуры тлумачыцца састарэлым уяўленнем пра сімвалізм як значнае

спараджэнне дэкадансу. Дэкаданс, у сваю чаргу, у сацыялагізаваным літаратуразнаўстве разумеўся адназначна як заняпад, вычварнасць, эстэтычная распуста» [4, с. 96].

Канешне, за апошнія гады ў айчынным літаратуразнаўстве адбыліся пазітыўныя зрухі, аднак у плане распрацоўкі адлюстравання ўяўленняў пра лёс мы пакуль саступаем нават расійскім даследчыкам – прадстаўнікам іншай постсавецкай краіны. Там распрацоўка адпаведнага пытання адбывалася ў першую чаргу праз вывучэнне антычнай культуры. Тэма лёсу закраналася ў такіх працах, як «Геродот» С. Я. Лур'е (1947), «Эсхил» В. Н. Ярхо (1958), «Эпос о Гильгамеше: ("О всё видавшем")» (1961) і «Эгейская предфилософия» (1970) А. М. Чанышава, а таксама ў многіх іншых кнігах і навуковых артыкулах. У 1990 г. праблема ўяўленняў пра лёс была вынесена ў назву манаграфіі В. П. Горана «Древнегреческая мифологема судьбы».

Пра цікавасць да вывучэння праблемы лёсу ў першыя постсавецкія часы сведчыць выхад зборніка «Понятие судьбы в контексте разных культур» (Масква, 1994). У сучаснай Расіі напісана і немалая колькасць дысертацыйных даследаванняў, прысвечаных праблеме лёсу ў літаратуры.

Адсутнасць жа адпаведных даследаванняў у беларускім літаратуразнаўстве можна абгрунтавана патлумачыць ідэалагічнымі абмежаваннямі, якія мелі месца ў савецкі (у першую чаргу сталінскі) перыяд і стварылі пэўную «традыцыю». Рэліктавае ўздзеянне гэтай «традыцыі» можна заўважыць і ў наш час. Пры гэтым даследаванне мастацкіх імагінацый лёсу ў літаратуры мае вялікі патэнцыял і з'яўляецца перспектыўным напрамкам сучаснага гістарычнага літаратуразнаўства.

Увогуле ж нераспрацаванасць тэмы сімвалаў фатуму ў помніках літаратуры Беларусі – толькі прыватны прыклад уплыву барацьбы з ідэалізмам. Ацаніць усе ўскосныя страты, панесеныя навукай праз азначаную палітычную кампанію, не ўяўляецца магчымым.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Бабровіч Л., Шпілеўскі І. Супроць контррэволюцыйных нацдэмаўскіх тэорый у этнографіі // Сав. краіна. 1931. № 1 (3). С. 42–56.

2. Бажанов В. А. Партия и логика. К истории одного судьбоносного постановления ЦК ВКП(Б) 1946 года // Логич. исслед. 2005. № 12. С. 32–48.

3. Вальфсон С. Я. Сучасная рэлігійнасьць (паводле матар'ялаў дасьледаваньня ў БССР). Менск : БАН, 1930. 120 с.

4. Васючэнка П. Беларуская літаратура пачатку XX стагоддзя ў кантэксце еўрапейскага сімвалізму // Скарыназнаўства, кнігазнаўства, літаратуразнаўства : матэрыялы III Міжнар. кангр. беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу

цывілізацый», Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г. / рэдкал. : У. Конан (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2001. С. 96–100.

5. Ватацы Н. Беларускае літаратуразнаўства і крытыка (1945–1963) : Бібліяграфія асобных выданняў. Мінск : Дзярж. бібліятэка БССР, 1964. 538 с.

6. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. / рэдкал. : В. Б. Евароўскі [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 2008–. Т. 3 : Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока / В. Б. Евароўскі [і інш.]. 2013. 615 с.

7. Гужалоўскі А. А. Чырвоны аловак : нарысы па гісторыі цэнзуры ў БССР : у 2 кн. Кн. 1 : 1919–1941 гг. Мінск : Рэдакцыя газеты "Звязда", 2012. 304 с.

8. Кацэнбоген С. З. Нарысы па гісторыі першабытнай культуры Беларусі // Полымя. 1924. № 1. С. 156–162.

9. Конон В. М. От Ренессанса к классицизму. Становление эстетической мысли Белоруссии в XVI–XVIII вв. Минск : Наука и техника, 1978. 160 с.

10. Кременцов Н. Л. Принцип конкурентного исключения // На переломе : советская биология в 20-х – 30-х гг. СПб., 1997. Вып. 1. С. 107–164.

11. Ленин В. И. Материализм и эмпириокритицизм [Электронны рэсурс] // В. И. Ленин. Рэжым доступу : https://www.magister.msk.ru/library/lenin/len14v00.htm. Дата доступу : 14.10.18.

12. О политико-идеологическом контроле над литературой в период реконструкции: Из доклада начальника Главлита П. И. Лебедева-Полянского на секретном совещании заведующих республиканскими Главлитами и Облкрайлитами в январе 1931 г. (стенограмма) // Цензура в Советском Союзе. 1917–1991. Документы / сост. А. В. Блюм. М. : РОССПЭН, 2004. С. 189–197.

13. О Пролеткультах : Письмо ЦК РКП // КПСС о культуре, просвещении и науке / ред. : В. С. Викторов [и др.]. М. : Политиздат, 1963. С. 146–148.

14. От Редакции // Под знаменем марксизма. 1922. № 1–2. С. 3–4.

15. Письмо тов. Л. Д. Троцкого // Под знаменем марксизма. 1922. № 1–2. С. 5–7.

16. Садоўскі П. Ф. Выкарчаваць контр-рэвалюцыйныя нацдэмаўскія ўстаноўкі ў экономічных пытаньнях // Сав. краіна. 1931. № 1 (3). С. 13–33.